# Мовазнаўства

УДК [811.161.2+811.161.3]'04'373.613

*І. П. КЛІМАЎ*

## НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ І ПРЫНЦЫПЫ АДАПТАЦЫІ ЗАПАЗЫЧАННЯЎ У БЛІЗКАРОДНАСНЫХ МОВАХ (НА СТАРАБЕЛАРУСКІМ/СТАРАЎКРАІНСКІМ МАТЭРЫЯЛЕ)

**Резюме.** Рассматривается специфика адаптаций заимствований в близкородственных и близкоструктурных языках. В центре внимания, в частности, такие виды, которые выделили некоторые исследователи во 2-й половине XX в., назвав их этимологическими субституциями (фонетическими и морфологическими). Обосновывается неправомерность отнесения такого термина к большому числу примеров, которые предлагается считать фактами поморфемного перевода. Только в случае заимствования уникальных морфем можно говорить о неких этимологических субституциях, хотя они были в действительности основаны на аналогии.

***Ключевые слова:*** заимствование; адаптация; субституция; поморфемный перевод; старобелорусский/староукраинский язык; польский язык.

**Abstract.** The specifics of borrowing adaptations in closely-related and closely-structural languages are discussed. In the focus of attention, there are particularly such phonetic and morphologic adaptations selected and named by some researchers in the 2nd half XX c. as the etymological substitutions. The author proves the wrongfulness of the appropriation of the term to a large number of examples, which he proposes to consider as the facts of the morpheme by morpheme translation. In the case of a borrowing unique morphemes only it can talk about etymological substitutions, although they are in really based apparently on the analogy.

***Key words:*** borrowing; adaptation; substitution; morpheme by morpheme translation; Old Belarusian/Old Ukrainian; Polish.

Працэс запазычання заўжды суправаджаецца адаптацыяй (таго ці іншага роду) – прыстасаваннем адзінкі з чужой мовы (мовы-донара) да сістэмных умоў той мовы, куды яна прыходзіць (мовы-рэцэптара). Такі працэс амаль абавязковы і непазбежны, ён выкліканы несупадзеннем сістэм розных моў, нават блізкароднасных і блізкаструктурных. Аднак любая адаптацыя адбываецца паводле пэўных правілаў, абумоўленых сістэмай мовы-рэцэптара, а таксама некаторымі сацыяльнымі і культурнымі ўмовамі, у якіх працякае такі кантакт, у дадатак яшчэ і псіхалагічнымі характарыстыкамі яго ўдзельнікаў. Гістарычна адаптацыя – не аднамомантавая з'ява, яна не абмежавана толькі актам інтэрферэнцыі ці перакладу, а ўяўляе сабой цэлы працэс, у якім вылучаюцца пэўныя стадыі, напрыклад: ніякая (калі адаптацыя адсутнічае ці незаўважная), частковая (ці лакальная), калі адаптацыя запазычання яшчэ не закончана, і поўная (гл. Haugen 1950, 214–215). Адпаведна і запазычанні ў любой мове можна разглядаць як мінімальна, часткова ці цалкам засвоеныя (гл. Демьянов 1990, 10), а само запазычанне – як працэс паступовай адаптацыі (Там жа, 9). Адначасова (і аднаразова) з адаптацыяй мае месца і захаванне (ці з гледзішча мовы-рэцэптара – перанос, або імпартаванне)* тых элементаў чужой мовы, якія падобныя (калі карыстальнікі не могуць знайсці адрозненняў, хаця апошнія аб'ектыўна існуюць – гэта, напрыклад, адценні алафонаў ці іх дыстрыбуцыя) або ідэнтычныя з сістэмай роднай мовы. Такія падабенствы ці ідэнтычнасці не з'яўляюцца рэдкімі або выпадковымі ў блізкароднасных (і блізкаструктурных) мовах, таму пры кантакце такіх моў адаптацыя нават цэлага слова можа проста не спатрэбіцца ці быць мінімальнай. Такія мовы могуць служыць выдатным матэрыялам для даследавання працэсаў і кірункаў адаптацыі на розных яе стадыях.

* Упершыню ўвагу на яго звярнуў Э. Хаўген, назваўшы яго пераносам, ці імпартаваннем (transfer, importation); імпартавацца можа таксама семантыка (гл. Haugen 1950, 212–213, 216). Ён адзначыў дзве стратэгіі білінгваў: імпартаваць або субстытаваць чужамоўныя мадэлі (узоры) (Там жа, 213). Гэта залежыць ад ступені іх авалодання чужой моваю: чым больш білінгв авалодвае чужой мовай, тым больш у яго імпартаванняў. Калі моналінгв успрымае іншамоўную форму ў такога білінгва, ён абавязкова падвяргае яе татальнай ці практычна татальнай субстытуцыі. Аднак словы, што не маюць critical sounds (нейкіх адрозных гукаў), нават моналінгвамі будуць імпартавацца без слядоў адаптацыі (Там жа, 216).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Найбольшую цікавасць у гэтым плане выклікае даўняя кніжна-пісьмовая мова беларусаў і ўкраінцаў (далей яна ўмоўна называецца «руськай», каб не ўжываць цяжкавагавы тэрмін «старабеларуская (стараўкраінская) мова» і ў той жа час пазбегнуць дыскусійнага вылучэння ў ёй беларускага ці ўкраінскага складнікаў, неістотнага для дадзенай працы). У гэтай мове мелася шмат разнастайных запазычанняў на розных лінгвістычных узроўнях (лексічных, семантычных, граматычных, сінтаксічных і інш.). Пры гэтым найбольш шматлікімі з іх былі паланізмы, а таксама элементы іншых моў (еўрапейскіх і ўсходніх), прынесеныя праз пасрэдніцтва польскай мовы. Таму ўвага многіх даследчыкаў «руськай» мовы накіравана менавіта на паланізмы; будуць яны ў цэнтры ўвагі і дадзенай працы, хаця і не выключна.

Натуральна, ва ўсіх запазычаннях «руськай» мовы адбываліся працэсы адаптацыі, якія зафіксаваны на розных стадыях. Багаты матэрыял па адаптацыі «руськіх» запазычанняў, асабліва з блізкароднасных моў, і перш за ўсё па паланізмах, сабраны ў працах многіх вучоных (гл. Худаш 1960; Гумецька 1962; Leeming 1968; Булыка 1970; Гумецька 1976; Булыка 1980, 210–228), у навуцы маецца таксама цікавы аналіз працэсаў адаптацыі і з іншага ўсходнеславянскага арэалу – Масковіі сярэдзіны XVII ст. (гл. Демьянов 1990; Демьянов 2001). Аднак тэрміналогія, якой карыстаюцца даследчыкі, тэарэтычны апарат, што выкарыстоўваецца для апісання працэсаў адаптацыі, далёкія ад урэгуляванасці. Адным з найбольш цікавых і неадназначных паняццяў, што ўжываецца ў працах многіх аўтараў, з'яўляецца субстытуцыя.

У лінгвістычнай навуцы пад субстытуцыяй разумеюць дакладныя адпаведнасці фанем і марфем, магчымыя паміж мовамі ў сітуацыі іх кантакту. Тэрмін «субстытуцыя» (падстаноўка) даволі даўняга паходжання, яго выкарыстоўвалі класікі сусветнага мовазнаўства (гл. Paul 1909, 394–396; Bloomfield [1933] 1945, 445–450); пад субстытуцыямі яны мелі на ўвазе найбольш блізкія да чужой мовы гукі роднай мовы, якія замяшчаюць чужамоўныя ў выніку запазычання ці ў працэсе знаёмства індывіда з чужой мовай. Піянер сусветнай кантакталогіі У. Вайнрайх адносіў паняцце субстытуцыі толькі да тых фанем, якія ідэнтычныя ў сістэмах дзвюх моў, але адрозніваюцца ў вымаўленні ці наогул у мове нейкімі асаблівасцямі або нерэлевантнымі дадатковымі рысамі (гл. Weinreich [1953] 1970, 19). Такім чынам, субстытуцыі ўласціва адэкватнасць – блізкасць да гука з іншамоўнай сістэмы, ва ўсялякім выпадку субстытуцыя ўспрымаецца аднамоўным слухачом найбольш адэкватна (Там жа, 24). Фактычна пры субстытуцыі білінгв аднолькава рэалізуе фанемы дзвюх моў, атаясамліваючы іх (Там жа, 24). Аднак субстытуцыя ў Вайнрайха – толькі адзін з магчымых тыпаў фанетычнай інтэрферэнцыі, даследчык вылучае яшчэ тры іншыя (недадыферэнцыяцыю, звышдыферэнцыяцыю, рэінтэрпрэтацыю), што даюць вынікі, інакшыя за субстытуцыю (Там жа, 18–19)*.

Вырашэнню тэарэтычнай праблемы, што лічыць найбольш блізкім ці адэкватным адпаведнікам чужому гуку, прысвечаны высілкі многіх вучоных (гл. Haugen 1950, 215; Демьянов 1990, 16–18). Аднак яна не з'яўляецца аб'ектам увагі ў дадзенай працы, тут важна толькі канстатаваць існаванне такой праблемы. Сапраўды, у межах аднаго гукатыпу (ці набору) могуць аб'ядноўвацца шматлікія і даволі разнастайныя субстытуцыі, якія пры інтэрферэнцыі ці запазычанні замяняюць адрозны гук чужой мовы (гл. Paul 1909, 395–396; Bloomfield [1933] 1945, 446–453). Пры гэтым такія субстытуцыі могуць быць вельмі нерэгулярнымі, а іх склад можа значна хістацца, калі розныя размоўцы непаслядоўна падстаўляюць то адны, то другія элементы роднай мовы – гэта так званы erratic substitution (Haugen 1950, 215–217). Склад такога гукатыпу (ці набору), натуральна, не адвольны, а абумоўлены многімі чыннікамі: структурнымі рысамі мовы-рэцэптара, сацыяльнымі і культурнымі ўмовамі кантакту, псіхалогіяй яго ўдзельнікаў.

Аднак у дыяхраніі гэтыя чыннікі застаюцца часта невядомымі ці вядомымі толькі прыблізна (напрыклад, моўная кампетэнцыя ці моўная свядомасць канкрэтнага аўтара). Таму ў дачыненні да гістарычнага (дыяхроннага) матэрыялу дастаткова складана, а то і праблематычна выкарыстоўваць падыходы і класіфікацыі, распрацаваныя У. Вайнрайхам пры аналізе сінхранічных маўленчых з'яў (інтэрферэнцыі). У дачыненні да гістарычных (ці культурных) запазычанняў** гэта азначае, што на практыцы да субстытуцый даводзіцца адносіць любыя замены гука чужой мовы элементамі роднай, якія фіксуюцца ў помніках пісьменства. У выніку субстытуцыяй можа лічыцца фактычна любое адхіленне запазычанага слова ад яго ўзору ў мове-крыніцы (вызначэнне такога ўзору само па сабе складае значную праблему). Адпаведна такія субстытуцыі могуць рэпрэзентаваць розныя тыпы інтэрферэнцыі, вылучаныя Вайнрайхам. Напрыклад, Э. Хаўген да субстытуцый адносіў любое неадэкватнае замяшчэнне чужамоўнага ўзору (Там жа, 212). На яго думку, субстытуцыя – гэта толькі імітацыя, прычым часам зусім непазнавальная для носьбітаў чужой мовы (Там жа, 215).

* Паводле У. Вайнрайха (гл. Weinreich [1953] 1970, 18–19), гэтыя тры тыпы наступныя: а) недадыферэнцыяцыя (калі блытаюцца два гукі, паколькі яны не маюць сабе адпаведнікаў у сістэме мовы-рэцэптара); б) звышдыферэнцыяцыя (калі гук мовы-донара перадаецца некалькімі гукамі, паколькі яго некаторыя збыткоўныя або нерэлевантныя (для мовы-донара) прыметы разглядаюцца носьбітам мовы-рэцэптара як рэлевантныя); в) рэінтэрпрэтацыя адрозненняў (калі гук мовы-донара перадаецца іншым гукам, паколькі яго істотныя прыметы проста не ўспрымаюцца носьбітам мовы-рэцэптара ці не лічацца ім рэлевантнымі).

** Культурнае запазычанне (cultural borrowing) – гэта такое, якое пакінула свае першапачатковае інтэрфераванае асяроддзе і пранікла ў маўленне маналінгваў, яно супрацьстаіць унутранаму запазычанню (intimate borrowing), якое ўзнікла ва ўмовах білінгвізму пры інтэрферэнцыі (гл. Bloomfield [1933] 1945, 444, 461–463). Выразнае адрозненне паміж гэтымі двума тыпамі запазычання магчыма правесці не заўжды (Там жа, 444–445), хаця апошнія запазычанні характарызуюцца большай колькасцю рэалізацый у больш шырокай семантычнай сферы (Там жа, 465).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку дыяхраністы вымушаны дэфінаваць субстытуцыі як любыя (замест дакладных) падстаноўкі гукаў у запазычаных словах ці нават зусім адмаўляцца ад лінгвістычнай дэфініцыі (субстытуцыі – гукі, прадстаўленыя ў пісьмовым выглядзе (гл. Демьянов 1990, 15)). Гэта адкрывае шлях да шырокага разумення субстытуцыі – ёю пачынаюць лічыцца дастаткова прыблізныя, нават умоўныя, передачы чужых гукаў у «руськім» помніку. Яна фактычна выступае сінонімам адаптацыі (хаця традыцыйна лічыцца, што субстытуцыя – гэта толькі адзін з відаў адаптацыі (гл. Bloomfield [1933] 1945, 446, 450; Демьянов 1990, 15)).

Звычайна даследчыкі не адрозніваюць розныя тыпы «руськіх» субстытуцый, класіфікуючы іх толькі па фанетычных параметрах (пары суадносных гукаў (сваёй і чужой мовы), зычныя, галосныя, спалучэнні кшталту **tort* (у выпадку паланізмаў) і да т. п.) (гл. Гумецька 1962; Гумецька 1976; Булыка 1970; Булыка 1980, 210–228). Аднак калі ўсё ж задацца мэтай дыферэнцаваць такія субстытуцыі (перш за ўсё на матэрыяле паланізмаў), то можна заўважыць, што ў «руськай» мове яны далёка не аднастайныя. Адны з іх здаюцца больш блізкімі да чужамоўнага маўлення (наколькі яно вядома для даўняй эпохі) – іх можна назваць (з пэўнай доляй умоўнасці) фанетычнымі, ці маўленчымі, напр.: *круль* < пол. *król*, *вонтпити* < пол. *wątpić*, *зейштье* < пол. *zejście*. Іншыя зусім не передаюць гукавай структуры чужой мовы ці перадаюць яе вельмі прыблізна, напр.: *кроль* ці *король*, *вутпити*, *зейстье* (гаворка, натуральна, толькі пра адрозныя фрагменты чужых слоў, тады як аднолькавыя, трэба лічыць, імпартуюцца, ці пераносяцца без змен). Сапраўды, у апошніх прыкладах зусім няма перадачы некаторых адметных фанетычных асаблівасцей мовы-донара (у дадзеным выпадку – польскай), у прыватнасці, тых гукаў і марфем, што адрозніваюцца ад «руськай» мовы. Даводзіцца прызнаць, што такія субстытуцыі з маўленчым засваеннем чужых слоў фактычна не звязаны. Затое гэты апошні тып выразна знаходзіцца ў аднosінах этымалагічнай блізкасці з элементамі мовы-рэцэптара (гл. Гумецька 1962, 54, 55), таму такія субстытуцыі Л. Гумецкая назвала этымалагічнымі. Іншыя даследчыкі гавораць толькі пра адаптацыі, аднак пад імі яны разумеюць фактычна ж тое, што і Гумецкая.

Мэта субстытуцый – максімальна прыстасаваць запазычанае слова да «руськай» мовы, засвоіць яго (Там жа, 60). Таму «руськія» аўтары імкнуліся ўвесці ў запазычанае слова этымалагічны адпаведнік, каб максімальна прыстасаваць такое слова да «руськай» сістэмы, а не проста дакладна передаць гучанне запазычанага слова (Там жа, 54). У выніку ўзніклі этымалагічныя субстытуцыі: «обусловленные прежде всего фактором этимологического соответствия, такие субституции принимают со временем форму регулярных фонетических корреляций», калі гуку *x* польскай мовы адпавядае гук *y* (Гумецкая 1962, 69) у «руськай» мове; многім з іх уласціва прыблізнасць. Атрымліваецца, што такія субстытуцыі дыктуюцца не якасцю гукаў, а нейкім этымалагічным чыннікам (гл. Гумецька 1962, 54, 53), этымалагічным прынцыпам (Там жа, 55), у іх аснове ляжыць «строго этимологически коррелируемый звук» (Демьянов 1990, 17), нешта накшталт «регулярних фонетичних кореляцій» (Гумецька 1962, 53).

Л. Гумецкая вылучала два прыёмы засваення запазычанняў: фанетычныя і марфемныя субстытуцыі (гл. Гумецкая 1962, 69)*. Да марфемных ёю былі аднесены словаўтваральныя субстытуцыі (некаторыя афіксы), кшталту суф. пол. *-ek-* > *-ок-*: *замокъ*, *маршалокъ*, *остаточный* (гл. Гумецька 1976, 72–73), і марфалагічныя: падвядзенне парадыгмаў зменных слоў пад дзеючыя ўсходнеславянскія парадыгмы, маючы на ўвазе некаторыя канчаткі і фіналі (Там жа, 73). Марфемныя субстытуцыі (названыя яшчэ «морфемной ассимиляци[ей]») яна лічыла таксама этымалагічнымі, але адзначала іх меншую (параўнальна з фанетычнымі) рэгулярнасць (гл. Гумецкая 1962, 69).

Паводле Л. Гумецкай, імкненне карыстальнікаў максімальна прыстасаваць іншамоўныя (польскія) элементы парадаксальным чынам прыводзіла да больш аддаленай і прыблізнай іх передачы. Гэта былі прыблізныя, дастаткова аддаленыя субстытуцыі (карэляцыі), а не спробы дакладна перадаць іншамоўныя формы (гл. Гумецька 1962, 54–55). З дадзенага палажэння даследчыца рабіла не менш парадаксальныя высновы: «руськія» аўтары выключна добра валодалі польскай мовай (Там жа, 55), а польскі ўплыў на «руськую» мову не адбіўся на старажытных помніках (Там жа, 53), паколькі ён туды фактычна не пранікаў з-за такога этымалагічнага «сіта».

Этымалагічныя субстытуцыі (фанетычныя і марфемныя) «руськай» мовы вельмі разнастайныя, напрыклад:

– наданне марфемам ці формам поўнагалосся, напр.: *перестрога* ‘заўвага, засцярога’ – пол. *przestroga*, *перепустилъ* – пол. *przepuścił*, *перешкода* – пол. *przeszkoda*;

– тыповы ўсходнеславянскі рэфлекс на месцы былых рэдукаваных, напр.: *глотати* – царк.-слав. *гълтати* (параўн.: бел. *глытаць*, укр. *глитати*), *восполъ* – пол. *wespół*, *сведоцтво* (*свядоцтво*) – пол. *świadectwo* (*świadectwo*), *скуточный* ‘паспяховы’ – пол. *skuteczny*;

– рэфлексы *-ч-* і *-ж-* на месцы прасл. **tj* / **ktj*, **dj*, напр.: *еженье* (ад *ежа*) – пол. *jedzenie*, *овочъ* – царк.-слав. *овощь* / пол. *owoc*;

– замена насавых галосных чыстымі, напр.: *озяблый* (*озеблый*) – царк.-слав. *озяблый* / пол. *ziębły*, *обтежливе* (*обтяжливе*) – пол. *obciężliwie*;

– замена пол. *rz* на *р*, напр.: *вресень* – пол. *wrzesień*, *тревикъ* ‘чаравік’ – пол. *trzewik*, *трода* ‘статак’ < пол. *trzoda*);

* Да марфемных запазычанняў адносяцца чужамоўныя марфемы ці функцыі марфем, што так або інакш уключаюцца ў сістэму мовы-рэцэптара. Натуральна, слова- ці формазменныя марфемы асобна ніколі не запазычваюцца, а пранікаюць толькі ў складзе вялікай колькасці аднаструктурных слоў-запазычанняў (гл. Paul 1909, 399–400; Bloomfield [1933] 1945, 453–454). У такіх блізкароднасных і блізкаструктурных мовах, як польская і «руская», вялікая колькасць марфем блізкая ці ідэнтычная і мае агульнае генетычнае паходжанне.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

– замена іншаславянскага (нетыповага для «руськага» пісьменства ў дадзенай функцыі) канчатка ўсходнеславянскім, напр.: *тело* (*тѣло*) – царк.-слав. *телесе*; *писары* – пол. *pisarzowe*; *въ доме* – пол. *w domu*.

Такіх этымалагічных субстытуцый ці адаптацый у «руськай» мове было адзначана шмат (гл. Гумецька 1962; Булыка 1970; Гумецька 1976; Булыка 1980, 210–228). Застаецца здзіўляцца, наколькі яны былі шырока вядомы «руськім» карыстальнікам (бі- ці трылінгвам), якія ўжывалі іх без істотных памылак ці блытаніны ў розных кутках краіны (і гэта – у данарматыўную эпоху!). Сапраўды, важная асаблівасць этымалагічных субстытуцый, якая кідаецца ў вочы, – амаль поўная іх безварыянтнасць, ці інакш – высокая рэгулярнасць (у розных помніках, у рознай аднаструктурнай лексіцы)*. У такіх субстытуцыях няма той варыятыўнасці, што назіраецца ў фанетычных (асабліва сярод неславянскіх запазычанняў). Разнастайнасць апошніх бачна ўжо з нямногіх прыкладаў: *персона/парсона/парсуна/персуна/порсуна* 'асоба; выява чалавека, партрэт' (Булыка 1980, 23), *рыцеръ/рицеръ/рыцаръ/рыцыръ/ритеръ/рытэръ/рыдель* (Там жа, 25), *султанъ/солтанъ/золтанъ/золданъ/солданъ* (Там жа, 27), *шпе(к)гъ/шпи(к)гъ/шпя(к)гъ* (Там жа, 25), *ратовати/ротовати/ретовати/рятовати* (і вытв.: *ратунокъ/ротунокъ/ретунокъ/рятунокъ*) (Там жа, 41–42). Яшчэ адна асаблівасць, якую лёгка зрабіць з прыведзеных прыкладаў, – этымалагічныя субстытуцыі зазнавала галоўным чынам лексіка славянскага паходжання, радзей – лацінскія і нямецкія запазычанні (гл. Гумецька 1981, 39). Апошнія, трэба меркаваць, гэта тыя, што прыходзілі ў складзе польскага ўплыву (і неслі сляды ўздзеяння польскай мовы), а таму, хутчэй за ўсё, усведамляліся карыстальнікамі як польскія словы. Яшчэ больш дзіўная рыса этымалагічных субстытуцый – іх аўтаномнасць. Л. Гумецкая прыйшла да высновы, што такія субстытуцыі зазнавалі нават гукі, якія мелі дакладныя адпаведнасці ў фанетычнай сістэме ўсходнеславянскай гаворкі, але не мелі іх у дадзеных марфемах запазычаных слоў (суадносіны кшталту пол. *powiat* – *повѣтъ*) (гл. Гумецкая 1962, 69).

На думку некаторых даследчыкаў, існуюць псіхалагічныя падставы для азначэння такой карэляцыі менавіта як этымалагічнай. Рэгулярныя міжмоўныя адпаведнасці магчымы дзякуючы таму, што носьбіты ўсведамляюць адрозненні паміж мовамі. Так, Я. Рыгер лічыў, што двухмоўныя носьбіты блізкароднасных дыялектаў (напрыклад, польскіх і ўкраінскіх) маюць уяўленні пра важнейшыя адпаведнасці паміж гэтымі мовамі (поўнагалоссе/няпоўнагалоссе, рэфлексы ў новых закрытых складах і інш.) і на гэтай падставе ажыццяўляюць адаптацыю запазычанняў (гл. Rieger 2002, 202). Нават У. Вайнрайх меркаваў, што ў генетычна роднасных сістэмах можа сустракацца прыватны тып адносін – нейкі спосаб (formula) аўтаматычнай канверсіі, калі гук і/ці комплекс гукаў (нават марфема) рэгулярна суадносіцца ў некалькіх мовах ці дыялектах, што змяншае дыстанцыю паміж імі і спрашчае білінгвальныя праблемы (гл. Weinreich [1953] 1970, 2). Праўда, ён не спыніўся на разглядзе такой сітуацыі падрабязна.

Аднак шэраг важных пярэчанняў прымушае сумнявацца ў тым, што падобныя з'явы і адносіны сапраўды існуюць, а этымалагічныя субстытуцыі з'яўляюцца відам адаптацыі, нават прыватным ці вельмі спецыфічным.

Па-першае, надта сумнеўныя кагнітыўныя падставы для этымалагічнай субстытуцыі. Атрымліваецца, што карыстальнікі не толькі добра валодалі дзвюма мовамі, але і шмат ведалі пра іх структуры і этымалогію, хаця існаванне падобных ведаў да XIX ст., ды яшчэ ў масавай свядомасці (паколькі прыклады такіх субстытуцый сустракаюцца ў самых розных помніках), неверагодна. Пры гэтым даўнія карыстальнікі, як ужо адзначалася, беспамылкова рабілі субстытуцыі нават у вельмі невідавочных выпадках. Прыкладам можа служыць перадача польскага пярэдняга насавога галоснага *ę* задннім адпаведнікам *у* кшталту *okręt* – *окрутъ* 'карабель', *występca* – *выступца* 'злачынец', *prędki* – *прудкий*. Такія замены нават немагчыма прызнаць субстытуцыямі ці адаптацыямі, паколькі тут адбываюцца далёка не адэкватныя паводле сваіх фанетыка-фаналагічных параметраў замены, а для іх ажыццяўлення патрэбны веды па гістарычнай граматыцы польскай мовы і ўсходнеславянскіх моў.

Нават калі дапусціць, што тут мела месца марфемная аналогія (*выступца*, бо *выступати*; *окрутъ*, бо *крутити*), а не замена гукаў (на падставе этымалагічнага аналізу), то ўсё роўна застаецца няясным, як карыстальнікі выбіралі правільны (і беспамылковы) узор для аналогіі ў неадназначных выпадках, гэта значыць там, дзе магчыма множнасная матывацыя (*прудкий* – няўжо ад *прудъ*, але чаму тады не ад *праду/пряду*? Таксама чаму *окрутъ* ад *крутити*, а не, напрыклад, ад паланізма *кроть*?). Для такіх выпадкаў у помніках няма і следу варыятыўнасці (напрыклад, адсутнічаюць **прадкий*/**прядкий* – толькі *прудкий*).

Па-другое, няясныя псіхалінгвістычныя аспекты падобнай субстытуцыі (нават калі і казаць пра нейкую аўтаматычную канверсію ў духу У. Вайнрайха). Каб утварыць у сваім маўленні правільныя адпаведнікі (out-put) шляхам адштурхоўвання ад зыходных (in-put) іншамоўных формаў, карыстальнікі павінны папярэдне аналізаваць іх. Паводле сучасных назіранняў, такі аналіз, як правіла, выклікае пэўныя

* Графіка-арфаграфічная нестабільнасць, уласцівая ўсяму данарматыўнаму пісьменству, у дадзеным выпадку не мае значэння для характарыстыкі такой безварыянтнасці і, натуральна, тут не ўлічваецца, параўн.: *боцянъ*, *боціянъ* < пол. *bocian*; *поветъ*, *повѣтъ* < пол. *powiat* (*powiet*); *люцкость*, *людзкость* 'гуманнасць' < пол. *ludzkość* (*luckość*) і да т. п. Таксама мог мець месца і ўплыў іншых моўных падсістэм, напрыклад арфаэпіі, што прыводзіла да нестабільнасці напісання паланізмаў, не звязанай з іх засваеннем, напр.: *подобеньство* і *подобенство* 'прыпавесць' < пол. *podobieństwo*; *святобливый* і *светобливый* (дзе *е* – праяўленне так званага «руськага» екання) < пол. *świętobliwy*.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

негатыўныя наступствы (напрыклад, затрымкі ў маўленні (рэтарадацыю) ці памылкі, якія ў маўленні часткова здымаюцца самакарэкцыяй). Аднак у «руськіх» паланізмах не сустракаецца няправільных формаў (кшталту пол. *okręt* > **окретъ* ці **окрунтъ*, пол. *występca* > **выступнца*; пол. *dług* > **длогъ* ці **дулгъ* (параўн. усх.-слав. *долгъ*); пол. *rzecz* > **ржечъ* ці **жечъ*), няма ў іх і транслітарацый неідэнтычных (з «руськай» мовай) фрагментаў слова (кшталту **окрятъ*, **выстяпца*, **длугъ*), якія трапляюцца ў маскоўскіх тэкстах XVII ст.: *писаржъ*, *прзими* 'прыймі' (для перадачы *rz*) і да т. п. На этымалагічныя субстытуцыі чамусьці зусім не ўплывалі ні народная этымалогія (спецыфічны від аналогіі – лексіка-семантычны), ні гіперкарэкцыя, ні маўленчыя працэсы (кшталту дыярэзы, метатэзы, асіміляцыі/дысіміляцыі, акамадацыі і інш.), якія часам істотна змянялі выгляд запазычаных слоў (што часткова можна назіраць у выпадку фанетычных (маўленчых) субстытуцый).

Па-трэцяе, кідаецца ў вочы структурная некангруэнтнасць, значная дыстанцыя паміж зыходнымі (in-put) і выніковымі (out-put) кампанентамі такога працэсу (калі яго прызнаваць адаптацыяй). У этымалагічных субстытуцыях часта назіраецца няроўная колькасць гукаў (напрыклад, пры поўнагалоссі/няпоўнагалоссі ці ў фіналях інфінітыва: *-Ro-* – *-oRo-* (дзе *R* – любы плаўны), як у пол. *pozdrowienie* – *поздоров(л)ен(ь)е* 'вітанне'; *-ć* – *-ти*, як у пол. *hołdować* – *голдовати*, пры тым што «руськай» мове вядомы і формы інфінітыва на *-ть*) або вельмі значнае адрозненне ў фанетыка-фаналагічных параметрах (напрыклад, насавыя няверхнія і чыстыя верхнія галосныя: *-ą-* – *-у-*, як у пол. *wtrącienie* – *втрученье*, ці насавыя пярэднія і чыстыя заднія галосныя: *-ę-* – *-у-*, як у пол. *popiędliwość* – *попудливость* 'імклівасць, гарачнасць', або насавыя заднія і чыстыя пярэднія: *-ą-* – *-я-* / *-а-*, як у пол. *mosiądz* – *мосязъ*/*мосяжъ* 'латунь', *nierząd* – *нерадъ* 'распуста'). Такая выразная структурная некангруэнтнасць наўрад ці можа быць дакладнай перадачай іншамоўнага ўзору (адаптацыяй ці субстытуцыяй), хаця некаторыя даследчыкі ў асобных абмежаваных выпадках допускаюць гэта (гл. Демьянов 1990, 16). З-за такой некангруэнтнасці мяжа паміж гукамі і марфемамі (морфамі) у падобным працэсе наогул сціраецца (у канверсіі пол. *przyzwoity* > *призвоитый* 'прыстойны' што замяняецца – *przy-* на *при-* ці *rz* на *r*? Таксама ў прыкладзе Гумецкай з суф. *-ek-* – *-ок-* што мае месца – замена марфемы ці субстытуцыя гука *е* на *о*?).

Па-чацвёртае, не можа не здзіўляць адначасовае суіснаванне (нават у адным помніку, у аднаго аўтара) некалькіх відаў адаптацыі аднаго і таго ж гука ў марфеме, што ў «руськіх» помніках нярэдкасць, напр.: *вутпити* і *вонтпити* (< пол. *wątpić*), *блакитный*/*блекитный* і *бланкитный*/*бленкитный* (< пол. *błękitny*) (гл. Булыка 1970, 119; Булыка 1980, 123, 130), *надза* і *нендза* (< пол. *nędza*), *зе(й)штье* і *зе(й)сце* (< пол. *zejście*), гэта значыць этымалагічнага і фанетычнага. Звычайна гэта тлумачыцца тым, што такія запазычанні ўзніклі ў розныя эпохі і, адпаведна, адлюстроўваюць розныя ўмовы адаптацыі (гл. Булыка 1970, 119; Булыка 1980, 216–217). Аднак спасылка на розную храналогію з'явы не раскрывае лінгвістычнай сутнасці такіх умоў, якія прывялі да нагэтулькі адрозных вынікаў адаптацыі.

Усё гэтыя пярэчанні прымушаюць зрабіць выснову, што тут, напэўна, хаваецца нейкая іншая з'ява, а не адаптацыя ці субстытуцыя паводле этымалагічных адпаведнасцей. На гэту з'яву даўно ўказаў Л. Яфрэмаў, аднак яго напрацоўкі чамусьці засталіся без увагі дыяхраністаў. Даследуючы спецыфіку калькавання, ён прыйшоў да высновы, што ў выпадках, падобных разгледжаным вышэй, мае месца не субстытуцыя, а памарфемны пераклад шляхам падвядзення пад словаўтварэнне, калі цалкам знішчаюцца сляды іншамоўнасці (гл. Ефремов 1974, 161). «Подведение заимствования под словообразование направлено на придание заимствованному слову полностью своеязычного облика, на усвоение слова как продукта собственной словообразовательной системы» (Там жа, 162).

Памарфемным перакладам даследчык называе паслядоўную замену марфем у слове з мовы-донара марфемамі мовы-рэцэптара (Там жа, 45, 97–98). Пры гэтым фактычна адбываецца гукавае пераўтварэнне марфемы (Там жа, 45), таму такі пераклад можна назваць яшчэ фанетычным (Там жа, 97). У гэтым выпадку ажыццяўляецца выдаленне слядоў іншамоўнасці, поўнае ці няпоўнае, дзеля чаго і выкарыстоўваюцца субстытуцыі – падстаноўкі гукаў (Там жа, 161–163). Такі памарфемны пераклад характэрны менавіта кантактам блізкароднасных моў (Там жа, 162).

Справа ў тым, што блізкароднасным мовам уласціва агульнасць дэрывацыйна-матывацыйных адзінак і марфемнага матэрыялу (Там жа, 164). Адносіны паміж такімі мовамі застаюцца «потенциально-диалектными», іх аднолькавыя ці блізкія элементы ўжываюцца ў агульным працэсе камунікацыі і такім чынам атаясамліваюцца (гл. Смирницкий 1959, 241)*. Такія элементы быццам «распознаются друг в друге», калі «чужое через свое воспринимается как свое» (Ефремов 1974, 166). Таму матываваныя словы пры запазычанні з такіх моў не падлягаюць дэматывацыі, а аднакаранёвыя словы не страчваюць роднасную сувязь паміж сабой (Там жа, 161). У блізкароднасных мовах агульная лексіка не можа ні запазычвацца, ні калькавацца, неагульная ж лексіка, утвораная з дапамогай агульных адзінак, таксама не можа быць аб'ектам калькавання, але можа запазычвацца, у тым ліку шляхам памарфемнага перакладу (Там жа, 165–166). «Лексическое заимствование из близкородственного языка путем

* Таксама А. Марцінэ адзначаў, што зносіны прадстаўнікоў блізкіх моў, кожнага на сваёй мове, напрыклад: датчан і нарвежцаў, чэхаў і славакаў (сюды можна дадаць беларусаў і рускіх) – не ўяўляюць вялікай камунікацыйнай праблемы і не патрабуюць перакладу або пераходу на іншую мову; такія мовы ўспрымаюцца як моцна адрозныя варыянты адна адной (гл. Weinreich [1953] 1970, viii). Таму і элементы такіх моў з'яўляюцца не столькі запазычаннямі, колькі вынікам інтэрферэнцыі (гл. Смирницкий 1959, 248), іх можна толькі ўмоўна лічыць запазычаннямі, паколькі ў блізкароднаснай мове яны функцыянуюць нароўні з аўтахтоннымі элементамі (Там жа, 249). Фактычна такую функцыю выконвалі паланізмы ў «руськай» мове.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ

фонетико-поморфемного перевода по своему результату обычно совпадает со словообразовательным актом заимствующего языка, т. е. приводит к появлению слова, которое язык мог бы оформить и сам, используя деривацию» (Ефремов 1974, 161).

Падобны погляд уласцівы і іншым вучоным. Так, Б. Вальчак разумее пад фанетычнай адаптацыяй толькі замену фанем іншамоўнага слова ідэнтычнымі ці бліжэйшымі з фанетычнага гледзішча фанемамі роднай мовы (гл. Walczak 1999, 124, 130, 131; Walczak 2010, 195), гэта значыць толькі блізкіх гукавых адпаведнасцей, да якіх не будуць адносіцца так званыя этымалагічныя гукавыя адпаведнасці (кшталту поўнагалосся/няпоўнагалосся, насавых/чыстых галосных), паколькі яны не блізкія, а даволі далёкія. Такія выпадкі даследчык прапануе лічыць відам перакладу, бачачы тут працэс калькавання (гл. Walczak 1999, 132), «kalki strukturalne (słowotwórcze)... w sytuacji kontaktu języków blisko spokrewnionych» (Walczak 2010, 197). Псіхалагічныя ж працэсы атаясамлівання ці ўсведамлення карыстальнікамі агульнасці дзвюх моў тут ролі не адыгрываюць (Там жа, 195). У доказ ён спасылаецца на мноства іншых запазычанняў (напрыклад, з рускай (магчыма, беларускай (Там жа, 194)) і чэшскай моў у польскую), дзе ніякіх этымалагічных субстытуцый не адбываецца, напр.: *rubież* (а не **rąbież*), *ruczaj* (а не **rączaj*), *hołubić* (а не **hołąbić*) (гл. Walczak 1999, 129, 130–131; Walczak 2010, 194–195, 197).

Гэта дазваляе заключыць, што памылкова за этымалагічныя субстытуцыі ў «руськай» мове часта прымаліся выпадкі памарфемнага перакладу, які ў блізкароднасных мовах нагадвае ўласнае словаўтварэнне ці супадае з ім. Рэгулярныя міжмоўныя адпаведнасці пры такім перакладзе былі хібна прыняты даследчыкамі за факты адаптацыі (і атрымалі назву этымалагічных субстытуцый). Аднак адсутнасць слядоў ці прымет інтэрферэнцыі ў такіх выпадках прымушае тлумачыць іх як факты памарфемнага перакладу. Пры гэтым такія факты неабходна выразна дыферэнцыраваць з рэальнымі выпадкамі фанетычнай (маўленчай) субстытуцыі*. Такая дыферэнцыяцыя павінна грунтавацца на правільным лінгвістычным разуменні субстытуцыі (як блізкай ці ідэнтычнай перадачы фанетычных асаблівасцей чужой мовы сродкамі роднай), а ў дачыненні да дыяхранічнага матэрыялу «руськай» мовы ўлічваць яшчэ і параметры фанетычнай адаптацыі запазычанняў, часткова адзначаныя вышэй: кангруэнтнасць, нестабільнасць і непаслядоўнасць, уздзеянне народнай этымалогіі і маўленчых працэсаў і інш. Такім чынам, неабходна строга размяжоўваць запазычанне і пераклад: пры запазычанні няма перакладу, а пераклад выключае запазычанне (гл. Ефремов 1974, 82).

Яскравым доказам індывідуальнага характару выкарыстання памарфемнага перакладу з'яўляецца некаторая непаслядоўнасць у яго ажыццяўленні. Зрэдку ў складзе «руськіх» паланізмаў сумяшчаюцца розныя марфемы – і ўсходнеславянскія, і заходнеславянскія, напр.: *весполокъ* і *восполекъ* (< пол. *wespółek*). Гэтыя словы даводзіцца трактаваць як полігенетычныя (гібрыдныя?), адны часткі (марфемы) якіх з'яўляюцца перакладзенымі, а іншыя – запазычанымі (перанесенымі). Такія выпадкі непаслядоўнасці ў адным і тым жа слове сведчаць, што гэта быў менавіта памарфемны пераклад, які ажыццяўляўся «руськімі» перакладчыкамі ці білінгвамі кожны раз нанова, а не браўся «ў спадчыну» ад папярэдніка(ў) з мовы. Калі б субстытуцыі ці адаптацыі гукаў у выглядзе нейкай аўтаматычнай канверсіі (у духу Вайнрайха) сапраўды адбываліся ў мове, то такіх полігенетычных слоў у ёй быць не магло б.

Тым не менш наогул адмаўляць наяўнасць нейкіх прыблізных ці аддаленых адаптацый пры памарфемным перакладзе не выпадае. Аднак гэта былі штучныя замены, што ўжываліся толькі ў мэтах выдалення слядоў іншамоўнасці ў тых марфемах, якім не знаходзілася адпаведнікаў у мове-рэцэптары. У такіх выпадках, як *вутп-ити*. *мосязъ*/*мосяжъ*. *надз-ный* і да т. п., карыстальнікі яўна не маглі падабраць адпаведныя марфемы ва ўсходнеславянскай гаворцы і таму, відаць, звярталіся да аналогіі (казаць пра этымалагічны аналіз з іх боку будзе ўсё ж яўнай мадэрнізацыяй для даўняй эпохі). Яны суадносілі гукі ў такіх унікальных марфемах з вынікамі адаптацыі спецыфічных іншамоўных гукаў у іншых марфемах і на гэтай падставе рабілі штучныя замены спецыфічных гукаў унікальных марфем. У «руськай» мове мелася дастаткова магчымасцей для суадносін такіх марфем (запазычанага і роднага слова) і ўсталявання паміж імі фанетычных адпаведнасцей (кшталту *-ą-* = *-у-*, *-ę-* = *-я-*, *-rz-* =*-р-*, поўнагалосся/няпоўнагалосся і інш.). Гэта і будуць этымалагічныя субстытуцыі ў сэнсе Гумецкай і іншых даследчыкаў, толькі абсяг іх выкарыстання трэба прызнаць даволі вузкім (унікальныя марфемы ў запазычаных словах) і абмяжоўваць пераважна (калі не выключна) кніжнай сферай. Прычым трэба выразна разумець, што гэта не былі нейкія фанетычныя з'явы (і ўжо тым больш этымалагізацыі), а толькі штучныя замены ў межах марфемы, звязаныя з выдаленнем слядоў іншамоўнасці ў запазычаных марфемах (згодна з поглядам Л. Яфрэмава).

Адным з вынікаў практыкаванага русінамі памарфемнага перакладу было з'яўленне ў «руськай» мове штучных формаў (кніжных?) кшталту *бологий* 'шчаслівы, добры' (< царк.-слав. *благий* / пол. *błodzy*; параўн. бел. *благі* 'паганы, кепскі', рус. *блажь* 'бздура, дурнота'), *польга* 'карысць' (< царк.-слав. *польза* і бел. *нельга*). Асабліва паказальна, што такія квазіправільныя ўтварэнні з'яўляліся пры наяўнасці як уласных аўтахтонных, так і запазычаных формаў, напрыклад *рожай* (< пол. *rodzaj*) пры больш тыповым

* Напрыклад, у паланізмах гэта: перадача насавых зычных польскай мовы праз два гукі (пол. *obojętny* > *обоентный* 'абыякавы', пол. *mąka* > *монка* 'мука'), перадача польскіх закрытых (так званых *е*, *о* pochylonych) галосных праз чыстыя, але на ўсходнеславянскай глебе немагчымыя ў дадзеных марфемах (*круль*, *суль*, *панувъ*; *пенязь*/*пинязь*, *мнемати*/*мнимати*, *керовати*/*кировати*), замена пол. *g* на *г* ці перадача праз *ґ*, *кг*, *к*, нават зрэдку (у кірылічным пісьме) *g* (*гды*, *кгвалтъ*, *крунтъ*, *швакрови*), і г. д.

*родъ* і паланізме *родзай*. Для такіх штучных утварэнняў не было істотнай патрэбы ў моўнай сістэме, аднак яны ўсё ж з'яўляліся ў ёй у выніку застасавання памарфемнага перакладу, як прадукт пэўнага падыходу, што практыкавалі карыстальнікі (відаць, толькі ў кніжнай мове).

Выкарыстанне ў рутэністыцы паняцця памарфемнага перакладу мае шматабяцальныя перспектывы. Яно дазваляе вытлумачыць многія няясныя ці спрэчныя да таго з'явы і пытанні. Перш за ўсё становіцца зразумелым, што ніякага выключна добрага ці масавага ведання польскай мовы беларусамі і ўкраінцамі не было (асобныя індывіды – не ў лік). Таксама істотна змяншаецца роля транслітарацыі, пра якую часта гавораць даследчыкі «руськага» перакладу. Многія факты блізкасці «руськай» мовы да польскай ці ідэнтычнасці з ёй такімі даследчыкамі тлумачацца як транслітарацыя (гл. Успенский 1983) або транскрыпцыя (гл. Leeming 1968, 283). У падобных выпадках, відаць, трэба шукаць або прамы перанос (захаванне) агульных элементаў, або памарфемны пераклад элементаў адрозных, але заснаваных на агульных. Нарэшце, у многім дэзавуіруюцца меркаванні пра выключна высокі піетэт даўніх беларусаў і ўкраінцаў да польскай мовы, іх адвечную прагу засвоіць гэту мову і навучыць ёй усіх астатніх сваіх землякоў, што не могуць гэтага зрабіць і вымушаны карыстацца нейкім недалугім паліятывам – «руськай» мовай (гл. Verkholantsev 2008, 138). Калі б такія мэты сапраўды стаялі перад даўнімі беларусамі і ўкраінцамі, то яны імкнуліся б як мага дакладней перадаваць фанетычную абалонку польскіх слоў, чаго ў сапраўднасці не назіраецца – з-за шырока практыкаванага памарфемнага перакладу, а таксама фанетычных (маўленчых) субстытуцый і штучных замен у запазычаных словах. Перакладчыкі і білінгвы адчувалі адрознасць «руськай» мовы, а таму далёка не ўсё пераносілі ў яе, многае перакладалі.

З дапамогай паняцця памарфемнага перакладу можна вырашыць і асобныя прыватныя пытанні, да таго спрэчныя ў рутэністыцы. Так, «руськім» помнікам вядома ўжыванне ў паланізмах літары *ѣ* ў адпаведнасць польскім літарам *ia* на месцы прасл. **ě*, напр.: *вспанѣле* (< пол. *wspaniale*), *запрѣлем ся* (< пол. *zaprzałem się*), *струхлѣло* (< пол. *struchlalo*), таксама прыклад Л. Гумецкай *повѣтъ* (< пол. *powiat*) і да т. п. Некаторыя лінгвісты бачаць у такіх выпадках, напрыклад, нейкую фанетычную ўкраінізацыю запазычаных паланізмаў (гл. Łesiów 1965, 359). На самай справе тут мае месца памарфемны пераклад, у выніку якога ўсходнеславянскія марфемы «ўстаўляюцца» ў склад польскага слова (ці, дакладней, цалкам замяшчаюць яго марфемы) і ўжо вымаўляюцца (і пішуцца) паводле нормаў і традыцый пэўнай мясцовасці (па-беларуску ці па-ўкраінску, у залежнасці ад карыстальніка).

Як бачна, у «руськай» мове для рутэнізацыі, ці ўсходнеславізацыі, тых элементаў, што запазычваліся з блізкароднасных і блізкаструктурных моў, перш за ўсё польскай, меўся цэлы набор даволі эфектыўных лінгвістычных прыёмаў: памарфемны пераклад, маўленчыя (фанетычныя) субстытуцыі, штучныя замены (два апошнія трэба адносіць да выпадкаў адаптацыі). Яны дазвалялі без асаблівых праблем для сістэмы роднай мовы засвоіць чужамоўную лексіку, уключыць яе ў сістэмныя адносіны і пры гэтым зберагчы асноўныя параметры такой сістэмы. Здаецца, што гэтыя прыёмы адзначаюцца ў гісторыі ўсіх моў свету, а гэта патрабуе супастаўлення вынікаў праведзенага аналізу з матэрыялам іншых моў і эпох.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


Булыка А. М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV–XVIII стст. Мінск, 1980.

Булыка А. М. Фанетычная і марфалагічная адаптацыя запазычанняў у старой беларускай мове // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1970. № 6. С. 115–124.

Гумецкая Л. Л. Фонетико-морфологические субституации в древнейших украинских заимствованиях из польского языка // Всесоюз. конф. по славянской филологии ([Ленинград], 17–22 дек. 1962 г.) : программы и тез. докл. Л., 1962. С. 69–70.

Гумецька Л. Л. З історичної лексикології української мови // Мовознавство. 1981. № 1. С. 38–45.

Гумецька Л. Л. Способи адаптації запозиченої лексики в староукраїнській мові // Мовознавство. 1976. № 4. С. 71–73.

Гумецька Л. Л. Фонетичні субституції в староукраїнських запозиченнях з польської мови // Дослідження і матеріали з української мови / відп. ред. І. П. Крип'якевич. Київ, 1962. Т. 5. С. 53–61.

Демьянов В. Г. Иноязычная лексика в истории русского языка XI–XVII веков: Проблемы морфологической адаптации. М., 2001.

Демьянов В. Г. Фонетико-морфологическая адаптация иноязычной лексики в русском языке XVII века / отв. ред. В. П. Вомперский. М., 1990.

[Ефремов Л. П.] Основы теории лексического калькирования : учеб. пособие. Алма-Ата, 1974.

Смирницкий А. И. Лексикология английского языка. М., 1959.

Успенский Б. А. Языковая ситуация Киевской Руси и ее значение для истории русского литературного языка : докл. на IX Междунар. съезде славистов. М., 1983.

Худаш М. Л. Спостереження над лексичними полонізмами в українській актовій мові кінця XVI – початку XVII ст. // Дослідження і матеріали з української мови. Київ, 1960. Т. 3. С. 121–139.

Якаўлеў С. М. Да пытання аб польскім марфалагічным уплыве на мову беларускай пісьменнасці XV–XVIII стст. // Беларуская лінгвістыка. 1984. Вып. 25. С. 33–39.

Bloomfield L. Language. New York, [1933] 1945.

Haugen E. The analysis of linguistic borrowing // Language. 1950. Vol. 26, № 2. P. 210–231.

Leeming H. Polonisms in a 17th-century Ruthenian text // Slavonic and East European review. 1968. Vol. 46, № 107. P. 282–314.

Łesiów M. Właściwości fonetyczne ukraińskiego języka pisanego XVII i początku XVIII wieku // Slavia Orientalis. 1965. № 3. S. 347–362.

Paul H. Prinzipien der Sprachgeschichte. 4. Aufl. Halle/Saale, 1909.

Rieger J. Zapożyczenia i ich funkcjonowanie w języku mniejszości (na przykładzie gwar polskich na Ukrainie i gwar ukraińskich w Polsce) // Z polskich studiów sławistycznych: Prace na 13 Międzynarodowy kongres slawistów w Lublanie. Seria 10. Językoznawstwo. Warszawa, 2002. S. 199–205.

Verkholantsev J. Ruthenica Bohemica: Ruthenian translations from Czech in the Grand Duchy of Lithuania and Poland. Wien ; Berlin, 2008. (Slavische Sprachgeschichte. Bd. 3).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

W a l c z a k B. Swoistość zapożyczeń z języków blisko spokrewnionych (na przykładzie zapożyczeń czeskich i wschodniosłowiańskich w języku polskim) // Linguistica Copernicana. 2010. № 2 (4). S. 189–199.
W a l c z a k B. Zapożyczenia leksykalne (formalnosemantyczne) czy kalki? O pewnym typie zapożyczen w kontaktach językow blisko spokrewnionych // Słowotwórstwo, semantyka i składnia językow słowiańskich. Katowice, 1999. T. 1. S. 124–133.
W e i n r e i c h U. Languages in contact: Findings and problems [photomechan. offprint: New York, 1953]. The Hague ; Paris, 1970.

Паступіў у рэдакцыю 05.06.2014

***Ігар Паўлавіч Клімаў*** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і сусветнай літаратуры БДУ культуры і мастацтваў.

*УДК 811.161.1'04'38*

*О. В. ЗУЕВА*

# ЛИНГВОКОММУНИКАТИВНАЯ ХАРАКТЕРИСТИКА ПОСЛЕДОВАТЕЛЕЙ ЛАТИНСКОЙ ВЕРЫ В ДРЕВНЕРУССКОЙ ЦЕРКОВНОЙ ПОЛЕМИКЕ

**Резюме.** На материале древнерусских текстов XI–XIII вв., направленных против последователей латинской веры, проанализированы способы вербализации устойчивого представления о *латинахъ* как носителях отрицательных лингвокоммуникативных свойств. Описаны эксплицирующие данное представление лексемы и словосочетания, установлена принадлежность последних к текстовым формулам, не имеющим жанровой закрепленности; указаны источники формул – Священное Писание и греческие полемические сочинения. Языковые данные сопоставлены с данными, полученными автором при исследовании древнерусских текстов против язычества; установлена общность мотива коммуникативной несостоятельности иноверцев по отношению к *латинамъ* и *поганимъ* и значительная близость его лексического выражения в проанализированных письменных памятниках.

***Ключевые слова:*** древнерусская письменность; полемика; латинская вера; языковое представление; коммуникативная характеристика; текстовая формула.

**Abstract.** On the material of Old Russian XI–XIII century's texts against the followers of the Latin faith the ways to verbalize sustainable idea of *Latins* as owners of poor ability to language communication are analyzed. Lexical units and phrases explicating this view are described; their belonging to text formulas without relation to the concrete genre is set; the sources of the formulas – the Holy Scriptures and Greek polemical writings – are dedicated. Language materials are compared with the material obtained by the author's study of Old Russian texts against paganism; the common motive of an infidel person's communication failure in relation to *Latins* and pagans and much proximity of its lexical expression in the analyzed literary monuments are revealed.

***Key words:*** Old Russian writing; polemics; Latin faith; language representation; communicative characteristics; text formula.

Один из устойчивых мотивов, существующих в рамках фундаментальной культурной оппозиции «свой – чужой», известный различным социумам и, возможно, имеющий универсальный характер, – это представление о некоей «коммуникативной ущербности» членов иного общества: несовершенстве и непрестижности их языка, отсутствии способности к ясной речи, неверном понимании смысла слов и т. п. Этот аспект отражаемой в языке ксенофобии разносторонне исследован на материале славянского фольклора и нелитературных форм существования современных национальных языков – просторечий, жаргонов, диалектов (см. Никитина 1993; Белова 2005; Каракулова 2005; Грищенко, Николина 2006; Березович 2011; Березович 2013; Бондаренко 2013). В историко-филологических трудах, посвященных исследованию лингвистической и конфессиональной полемики периода позднего русского средневековья и современности, показано отражение названного представления в текстах, принадлежащих к элитарной славянской языковой культуре (см. Мечковская 1987; Толстой 1988; Успенский 1996; Мечковская 2000; Кортава 2006; Кортава 2006 [а]; Сазонова 2007).

Источником нашего исследования стали памятники древнерусского периода – оригинальные и переводные сочинения XI–XIII вв. сторонников *правоѣ вѣры*, направленных против последователей *вѣры латиньскоѣ*. Это летописные фрагменты, послания духовных лиц, статьи в сборниках церковных законов, славянские переводы сочинений греческих церковных иерархов – тексты, в которых присутствует вербализация характеристики *латинъ* (*иновѣрныхъ*, *кривовѣрныхъ*, *въ иной вѣрѣ сущихъ*) как носителей специфических лингвокоммуникативных свойств, резко и отрицательно отличающих их от *правовѣрныхъ*. Анализу способов вербального выражения данной характеристики в контексте исследования языковой концептуализации феномена «иная вера» посвящена настоящая статья.

В статье ПВЛ 988 г. помещено пространное обращение греческого духовенства к принявшему христианскую веру князю Владимиру с приведением Символа веры и объяснением, почему нельзя разделять учение латин: *Не приимай же от латынѣ учения, их же **учение развращено**: влѣзъше бо вь церковь, не покланяються иконамъ, но стоя поклониться* <...> *Сего бо **апостоли не предаша*** (ПВЛ, 128) (здесь и далее примеры приводятся в упрощенной кириллической графике с пунктуационным смысловым членением, не всегда присутствующим в публикациях-источниках). Это одно из многочисленных «общих мест» антилатинских обвинений, которые встречаются в разных средневековых сочинениях и выражаются одним и тем же набором текстовых формул (два примера последних выделены шрифтом). Далее в статье перечисляются Вселенские соборы и приводится известный легендарный сюжет: *По семемь же сборѣ **Петръ Гугнивый** сь иними шедъ в Римъ и прѣстолъ вьсхытивъ, развративъ вѣру, отвѣргься престола Ерусалимьскаго, и Александрѣйскаго, и Цесаряграда и Антиохийскаго. И возмутиша Италию всю, сѣюще учение свое раздно* (Там же, 130). Петр Гугнивый, комментирует О. В. Творогов, «символический образ папы-отступника» (Там же, 435).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ